**Мароз, М.** Шчаслівая доля афганца і бацькі / М. Мароз // Герой працы. — 1997. — 13 снеж. — С. 2.

**ШЧАСЛІВАЯ ДОЛЯ АФГАНЦА І БАЦЬКІ**



– А навошта пра нас пісаць? – замахаў рукамі, прапускаючы ў пярэдні пакой кватэры, шчуплаваты малады мужчына. Неўзабаве з абярэмам вытрасеных дывановых дарожак адчыніла дзверы гаспадыня.

– Ну, чаго вы стаіце ў парозе? Праходзьце. Ну, вось яшчэ – навошта сцягваць чаравікі. Гэта розуму не прыкласці, колькі смецця за дзень пераносіцца.

Кватэра ў сям'і Ішчукоў з г. П. Обаль на тры пакоі. У святліцы – куды правёў нас гаспадар, па-свойму хараша і ўтульна. З кухні за незнаёмымі цікуе старая: па якой жа патрэбе?

– Жывём увасьмярых, – ці то паскардзілася на цеснату, ці сказала з тым прыкідам, што ўсё ж сумаваць не даводзіцца, маладая, жвавая і спрытная ў рухах гаспадыня. – Пяцёра дзяцей ды мая старэнькая мама.

Думалі мы, што ў Ішчукоў сустрэне нас дзіцячы тлум ды беганіна. Памыліліся. Ціхенька хадзіла па пакоях дзяўчынка гадоў шасці: то прыгарнецца да мамы, то падбяжыць, уссядзе на бацькавы калені.

– З імі тут здзяцінееш, – смяецца Людміла, гаспадыня.– Сёння Валера ў начную змену, дык ён з імі бавіцца. А я па кухні, з палавікамі вось ваюю.

Для пецярых дзяцей у кватэры дужа ціха, ледзь не вусцішна. Аказваецца, двое ў школе і два браты-блізняткі спяць. Ціхі час. Ледзьве ўклалі – адзін дык нічога, спакойны, другі ж усё плача, піскля нейкі. Так ці то смехам, ці то ўсур'ёз расказвае гаманкая Людміла. Валера не так, відаць, ахвочы да гаворкі, але ўсё ж з жонкай не згаджаецца: "Няпраўда, дзіця як дзіця".

– Чаму ўсё ж пяцёра дзяцей? – без усякай дыпламатыі прыціснулі пытаннем Валеру да крэсла.

Ён сумеўся, трохі пачырванеў пабітым на афганскай вайне тварам, але адказаў так, што яму паверыш:

– Гнаў да сына. А выйшла... вунь спяць двайняты. Люда, калі сказалі ёй пра гэта, плакала наўзрыд, а я смяяўся. Усё ж у хаце будзе трое мужчын.

Паверылася і ў апошнія Валеравы словы: тут і жарт, і сур'ёзна – ці можа дапусціць такога жаночага засілля ў сям´і. Ды і не думалася тады пра лішнія клопаты, хацелася радавацца за сыноў. Свае ж, родная крывіначка. Людзі вунь чужых бяруць у сем´і, няньчаць, ставяць на ногі.

Валера верыць у нейкі фатум або, як кажуць немцы, шыкзаль. Нямецкае слова – як цвік, нешта сапраўды цяжкое, неадольнае, чым чалавеку не пад сілу распараджацца. Можа, і пяцёра дзяцей было начэрчана на долі Валеры, хаця ні ў яго сваякоў, ні ў яе двайнят ці гэтулькі дзяцей не было. А вось што тычыцца Афганістана – тут ён у фатум паверыў.

Афганістан уварваўся ў жыццё маладога юнака з Суража гэтак жа не чакана, як і для многіх бязвусых юнакоў і маладых выпускнікоў вучылішчаў. Не помніць ён, каб адольваў яго нейкі страх

перад душманамі, перад тымі, каго лічылі за заклятых ворагаў. Вучэбка пад Рыгай, пасля Калінінград. А калі сказалі, што вылятаюць у “Афган" – было па-юначы, па-салдацкаму і нетрывожна, і нястрашліва.

І трывогі не цяснілі сэрца, не даймала нейкая боязь трапіць пад кулю аж да апошніх дзён службы. У мірны час не думалася, што загінеш. Па першым часе нават не насіў каску. Але ўсё-такі пра той лёс, які ў кожнага свой. Валера Ішчук служыў мінамётчыкам, неўзабаве быў прызначаны памкамузвода. Маладзенькі лейтэнанцік з Баку, камандзір узвода, атрымаўшы водпуск, паехаўшы дамоў халасцяком, у часць вярнуўся чалавекам жанатым. Вясёлы, гаманкі, ён пачаў сябе весці больш асцярожна, шанаваў сябе. Выйшлі неяк хлопцы на чыстае поле з мінамётамі (быў загад ачысціць горы ад душманаў), а лейтэнант стаяў за дрэвам. Усім, хто быў як на далоні – нічога, а бакінцу куля трапіла прама ў галаву. Вось і прыходзіць да думкі Валерый: ад долі сваёй ці нядолі не схаваешся ні за дрэвам, ні за чужой спіной.

– Нарадзіўся я ў кашулі, – смяецца Валерый Ішчук.

12 мая 1981. Спякота, пражыць так, што цяжка дыхаць. Ваду завозілі за 80 кіламетраў, і пакуль яе даставяць, станавілася яна такой цёплай і нясмачнай, што ніколі не магла спаталіць смагу. Захварэў Валерый, як і многія байцы, на гепатыт, месяц адваляўся ў Ташкенце, а пасля зноў – на перадавую.

Дык вось раней, калі не думалася пра вяртанне дамоў, загінуць не баяўся. Затое перад самым адлётам на радзіму жыццё стала такім дарагім, так не хацелася скласці на чужбіне галаву, што гэтым вяртаннем ён пачаў трызніць. Тады ўжо з’явіліся і бронежылеты. Дык вось 12 мая ехалі ў машыне, тут раптам абстрэл такі масіраваны, што не паспеў зразумець, што да чаго, як страціў прытомнасць. Толькі помніць, як кулі рыкашэтам ад брані пашкодзілі твар, і вось такі, акрываўлены, зняможаны ачнуўся ён, і першай думкай “Ці жывы я?”. Пакратаў нагой, падцягнуў да сябе, падцягнуў другую, і тады заплакаў – ад шчасця, ад радасці, што жывым нарэшце выйдзе з гэтага пекла.

Гэта быў апошні яго бой. А заўтра – дамоў, на радзіму...

Людміла не перапыняла мужавай споведзі, то забягала ў святліцу, праноўвала чай, то зноў знікала на кухні.

– Жывем як набяжыць, смяялася яна, хаця ад такіх слоў упару некаму заплакаць. Магчыма, яна шукала нагоды, каб некаму чужому выказаць свой боль, вызваліць сваё сэрца ад цяжару і самоты. – Калі б не мая сястра, што ў Маскве, – быў бы нам каюк. Ну, што гэта за грошы: ён на керамічным заводзе 3 мільёны рублёў, і то летам, і я паўтара мільёна на дзяцей. Сястра прыедзе, прывязе вопратку дзецям, і грошай. Калі папраўдзе, сёння ў хаце пуста. Летам жылі з дзецьмі ў мамы на дачы, у вёсцы Мосарава. Гэта недалёка ад Сіроціна. Грыбкі, ягады, парасё гадавалі. На зіму закатак, засолак хапае. А калі б мужу зарплату ды мае грошы на дзяцей давалі ў пару – было б куды спраўней...

Слухалі, дзівіліся з таго, як безапеляцыйна адключылі за несвоечасовую плату тэлефон, даводзячы, што “тэлефон – гэта раскоша”, як адзін адказны работнік з раёна папракнуў, як убрыкнуў, маўляў, наплодзяць дзяцей, а тады качаюць правы, – слухалі і рабілася горка і прыкра за тых, хто не ўмее паважаць пачуццё маці, прагу мужчыны вырасціць, даць краіне салдата, мужчыну, кармільца.

Сям'я Ішчукоў – не з тых, аб якіх будуць ісці ганебныя чуткі, калі дзеці і не даядаюць, і ходзяць у рыззі, басанож. Не! А калі так, то і станаўленне да людзей, хто рызыкнуў на няпросты крок, павінна быць і наўшаноўным, і самым пачцівым.

– А то беларусы неўзабаве будуць занесены ў Чырвоную кнігу, прыкладна так падвёў рысу нашай размовы гаспадар, чалавек рахманы, бяскрыўдны, які крочыць нялёгкай, але шчаслівай жыццёвай сцяжынкай.

**М. Мароз**